Грамадства

Форум IT-Акадэмграда «Штучны інтэлект у Беларусі» праходзіць у Мінску

Аўтар: Алена Дзядзюля

14.10.2026 | 16:40

Якія новыя магчымасці адкрываюцца дзякуючы выкарыстанню ШІ



V Міжнародны форум IT-Акадэмграда «Штучны інтэлект у Беларусі» сабраў больш як 330 айчынных і замежных спецыялістаў з Беларусі, Расіі, Кітая, Узбекістана і Турцыі. Традыцыйна ён стаў пляцоўкай, дзе спецыялісты рознага профілю абменьваюцца дасягненнямі, прапануюць сучасныя рашэнні для вырашэння актуальных задач у эканоміцы, сацыяльнай сферы і іншых галінах, намячаюць новыя вектары для міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння.

Адкрываючы форум, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Каранік адзначыў, што тэхналогіі змяняюць жыццё, рэальны сектар эканомікі, адукацыю, сферу паслуг і нават дзяржкіраванне. Сёння стаіць задача аб’яднаць намаганні не толькі вучоных, але і прадстаўнікоў прадпрыемстваў, бізнесу, іншых сфер, якія з’яўляюцца спажыўцамі і распрацоўшчыкамі новых рашэнняў, звязаных з ШІ. Толькі так мы зможам захаваць канкурэнтаздольнасць, прадстаўляць свету распрацоўкі, якія не маюць аналагаў. Пры гэтым важна не забывацца пра кібербяспеку, абарону даных.



Міністр сувязі і інфарматызацыі Кірыл Залескі падчас адкрыцця форуму расказаў, што сёння міністэрствам удзяляецца вялікая ўвага развіццю новых тэхналогій. Каб ісці ў нагу з часам, важна разумець, як і для якіх мэт зараз можна ўкараняць інструменты ШІ. Ад гэтага залежыць эфектыўнасць работы ў розных сферах.



Сачыць за бяспекай і эканоміць рэсурсы

У рамках форуму ў Прэзідыуме НАН адкрылася выстаўка айчынных распрацовак у галіне ШІ і робататэхнікі: ад прапаноў вучоных да студэнцкіх стартапаў. Яны дазваляюць убачыць, як шырока сёння выкарыстоўваюцца новыя тэхналогіі. Напрыклад, робататэхнічныя комплексы забяспечваюць аўтаматызацыю зварачных і зборачных аперацый, садзейнічаюць якасці і дакладнасці тэхналагічных працэсаў, эканоміі рэсурсаў. Робаты шырока выкарыстоўваюцца ў харчовай прамысловасці, дапамагаюць вырашаць пытанні, звязаныя з дэфіцытам кадраў, нарошчваць вытворчасць, бо робат можа працаваць круглыя суткі, кантраляваць якасць і бяспеку прадукцыі.



Навукова-вытворчы цэнтр беспілотных комплексаў НАН прадставіў вертыкальны апарат узлёту-пасадкі і апарат па перахопе паветраных цэляў. Дзякуючы ШІ гэтыя навінкі можна выкарыстоўваць для выяўлення наземных і паветраных аб’ектаў, іх суправаджэння. Напрыклад, па камандзе аператара лятальны апарат можа рухацца за пэўным аўтамабілем, сачыць за бяспекай на дарозе, перахопліваць несанкцыянаваныя лятальныя апараты. Сёння актыўна выкарыстоўваецца візуальная навігацыя, што дазваляе кіраваць апаратам нават пры адсутнасці спадарожнікавых сігналаў. Дрон на аналізе відэа паверхні вызначыць месца і здзейсніць палёт па зададзеным маршруце. Лятальны апарат можа выкарыстоўвацца для розных мэт, напрыклад, дзякуючы праграмнаму забеспячэнню і камерам займацца пошукам усыхаючых дрэў і фіксацыяй інвазійных раслін.

Сярод распрацовак, прадстаўленых Аб’яднаным інстытутам праблем інфарматыкі НАН Беларусі, — інструменты для апрацоўкі даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, медыцынскай дыягностыкі хвароб, распрацоўкі лекаў, выбару тактыкі ў клінічнай трансфузіялогіі, праграмны комплекс «Сакрат», які дазваляе хутка навучацца і выкарыстоўваць штучны інтэлект у розных сферах — ад сістэмы адукацыі да кіравання прадпрыемствам. Вучоныя прэзентавалі аўдыягід для Батанічнага сада, сістэму распазнавання галасоў птушак.





Распрацоўкі, прадстаўленыя на выстаўцы, паказваюць, як у нашай краіне вырашаюцца пытанні тэхналагічнай незалежнасці. Увядзенне санкцый на пастаўку оптыкі і акустыкі прымусіла інжынераў шукаць новыя рашэнні. У Беларусі створана акустычная сістэма выяўлення беспілотных лятальных апаратаў «Сканер», адна з нямногіх у нашай краіне даведзеная да прамысловага ўзору. Яна дазваляе бачыць беспілотныя лятальныя апараты сучаснага пакалення, а таксама мультыкоптарныя сістэмы. Можа працаваць 24 на 7, не мае выдзяленняў, працуе на акумулятарах, мабільная і лёгкая ў абслугоўванні.

Убачыць радыяцыю і кіраваць кар’ернай тэхнікай

Свае дасягненні прадстаўлялі ВНУ краіны. Студэнты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта распрацавалі праграмнае забеспячэнне для сэрвіснага робата і робата-сабакі. У 2019 годзе ў адказ на запыт буйных прадпрыемстваў у галіне аўтаматызацыі і робататэхнікі пры ўніверсітэце створана лабараторыя «Прамысловая робататэхніка», якая дазваляе як непасрэдна рыхтаваць кадры, так і арганізоўваць сумесную работу ўніверсітэта і прадпрыемстваў над інавацыямі.





Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт прадставіў камеру Вільсана на элементах Пельцье з інтэлектуальнай сістэмай аналізу трэкаў заражаных часціц. Дадзеная ўстаноўка -адзіная ў ВНУ краіны, якая дазваляе «ўбачыць радыяцыю». Ідэю для распрацоўкі падказалі студэнты, якія праходзілі падрыхтоўку па спецыяльнасці «праектаванне і эксплуатацыя атамных электрастанцый». Распрацоўка ствараласяся найперш для вучэбных мэт, каб абудзіць цікавасць у маладога пакалення да вывучэння ядзернай фізікі.



БДУІР прадставіў праект па аўтаматызаванай персаніфікаванай сістэме кісларoднай тэрапіі. Яна дазваляе праводзіць падбор і карэкцыю тэрапіі ў рэжыме рэальнага часу на аснове зваротнай сувязі аб стане пацыента. Аналізуе сатурацыю, тэмпературу, пульс і частату дыхання чалавека і на аснове гэтых параметраў вызначае, якую колькасць кісларoду і на працягу якога часу трэба падаваць пацыенту. Гэта распрацоўка можа выкарыстоўвацца не толькі для лячэння хвароб органаў дыхання. У далейшым яна б магла быць карыснай у авіяцыі, спорце, пры падводных работах з аквалангам. Дарэчы, распрацоўка была адзначана як адна з лепшых на конкурсе «Лідары штучнага інтэлекту», які праводзіцца ў рамках форуму.

Сярод адзначаных навінак і аўтаматызаваная сістэма кіравання беспілотнай кар’ернай тэхнікай на аснове штучнага інтэлекту. Сістэма аб’ядноўвае тэхналогіі камп’ютарнага зроку нейрасеткавага распазнавання перашкод і інтэлектуальнага планавання маршрутаў.



ШІ адкрывае новыя магчымасці для прамысловасці, дазваляе ўдасканальваць вытворчыя працэсы, павышаць эфектыўнасць прадпрыемстваў і ствараць канкурэнтаздольныя прадукты. Звяртаючы ўвагу на перавагі, якія адкрываюць перад прадпрыемствамі новыя тэхналогіі, **міністр прамысловасці Андрэй Кузняцоў** адзначыў, што сёння важна не падмяніць людзей, — штучны інтэлект павінен быць памочнікам спецыялістаў. Толькі так мы можам развіваць кампетэнцыі. Ён падкрэсліў, што штучны інтэлект дазваляе паскараць распрацоўку новай прадукцыі: «Мы аўтаматызуем механічную апрацоўку, канструяванне і праектаванне машынных вузлоў. Дзякуючы гэтаму працэсы кратна паскараюцца: калі раней пераход ад адной мадэлі да іншай займаў пяць-шэсць гадоў, сёння ўкладваемся ў двух-, трохгадовы цыкл».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

Фота Валерыя КАРТУЛЯ